**ВОДЗЫЎ**

афіцыйнага апанента кандыдата філалагічных навук, дацэнта Лапцёнак Ірыны Браніславаўны на дысертацыю Карп Алены Аляксандраўны «Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс», прадстаўленую да абароны на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Дысертацыя А.А. Карп прысвечана даследаванню асаблівасцей станаўлення і развіцця эстэтычнага дыскурсу ў беларускай літаратурнай крытыцы, вызначэнню яго пераемнасці і дэтэрмінаванасці на матэрыяле крытычных тэкстаў 1900–1930-х гг.

У главе 1 «Станаўленне эстэтычнага дыскурсу ў нашаніўскі перыяд» саіскальнік разглядае эстэтычны дыскурс беларускай літаратурнай крытыкі на этапе яе фарміравання, аналізуе публікацыі, адсочвае станаўленне і эвалюцыю крытычнай думкі, разглядае ідэйна-эстэтычныя асновы нашаніўскай крытыкі ў працах В. Ластоўскага, С. Палуяна, М. Багдановіча.

Другая глава «Праблемы і набыткі эстэтычнага дыскурсу ў крытыцы 1920-х гадоў» прысвечана даследаванню эстэтычнага дыскурсу на матэрыяле крытычных тэкстаў, прадстаўленых у найбольш значных тагачасных літаратурна-мастацкіх выданнях, разглядаюцца асаблівасці выяўленых у іх камунікатыўных стратэгій, адметнасць прафесійных падыходаў і стылістыкі, творчасць асобных, найбольш аўтарытэтных крытыкаў.

У главе 3 «Эстэтычны дыскурс у змаганні з вульгарна-сацыялагічнай крытыкай» ахарактарызавана літаратурная крытыка 1930-х гг., вызначаны ўмовы яе функцыянавання, праведзены аналіз прац, у якіх прэваліруюць эстэтычныя прынцыпы, прадстаўлена канцэпцыя літаратурнай крытыкі Я. Коласа.

У Заключэнні адлюстраваны асноўныя навуковыя вынікі даследавання.

Змест дысертацыі, методыка пастаноўкі і вырашэння тэарэтычных праблем, даследаванне фактычнага матэрыялу пацвярджаюць грунтоўнасць і актуальнасць праведзенага даследавання, яго адпаведнасць патрабаванням сучаснай літаратуразнаўчай тэорыі і практыкі, што дазваляе зрабіць выснову аб тым, што дысертацыя А.А. Карп «Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс» з'яўляецца самастойнай кваліфікацыйнай навуковай работай і адпавядае галіне навукі, па якой яна прадстаўлена да абароны (філалагічныя навукі), і спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія, а таксама патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да дысертацый на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі адбываецца актыўнае пераасэнсаванне літаратурнай спадчыны, узрастае цікавасць да праблемы традыцый і наватарства. У гэтым кантэксце асабліва актуальным і своечасовым з'яўляецца зварот да беларускай крытыкі першай трэці ХХ ст., да таго часу, калі закладаліся эстэтычныя прынцыпы асэнсавання і ацэнкі мастацкіх тэкстаў, без вывучэння і навуковага асэнсавання якіх уяўленне пра развіццё літаратурнага працэсу з'яўляецца няпоўным.

Актуальнасць тэматыкі і праблематыкі дысертацыі на сучасным этапе выклікана неабходнасцю фарміравання цэласнага ўяўлення пра развіццё крытыкі, тагачасны літаратурны працэс, вывучэння спадчыны вядомых беларускіх літаратараў.

Важным уяўляецца ўвага саіскальніка да разгляду дыскусій, творчага ўзаемадзеяння супольнасцей, сфарміраваных вакол найбольш значных выданняў, літаб'яднанняў, і знакавых, і малавядомых постацей, якія актывізавалі крытычную думку, спрыялі яе развіццю, што, у сваю чаргу, садзейнічала фарміраванню і эвалюцыі эстэтычнага дыскурсу.

Актуалізацыя разгляду беларускай крытыкі першай трэці ХХ ст. у эстэтычным дыскурсе выклікана таксама наяўнасцю вялікага аб'ёму эмпірычнага матэрыялу, які тычыцца даследавання літаратурна-крытычнай думкі ў рамках канцэпцыі, прапанаванай саіскальнікам, што, у сваю чаргу, спрыяе пашырэнню метадалогіі крытыкі, увядзенню тэкстаў у сучасны ракурс разгляду беларускага літаратуразнаўства.

**Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

У дысертацыі А. А. Карп упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве комплексна і сістэмна разглядаецца фарміраванне, выяўленне і эвалюцыя эстэтычнага дыскурсу ў беларускай крытыцы першай трэці ХХ ст. – з улікам камунікатыўнай прыроды крытыкі, на працягу трох узаемазвязаных перыядаў (нашаніўскага, 1920-х і 1930-х гг.).

У дысертацыі выкарыстаны шырокі пласт эмпірычных матэрыялаў, разгляд якіх характарызуецца глыбінёй і скрупулёзнасцю аналізу, – літаратурна-крытычных тэкстаў, прадстаўленых у газеце «Наша ніва», часопісах «Полымя», «Маладосць», «Узвышша», выданнях твораў В. Ластоўскага, С. Палуяна, М. Багдановіча, Я. Коласа і інш.

Тэарэтыка-метадалагічнае і навукова-прыкладное значэнне мае шырокае выкарыстанне саіскальнікам паняццяў, якія спрыяюць развіццю тэрміналагічнай базы беларускага літаратуразнаўства. Паняцце «эстэтычны дыскурс» разглядаецца на аснове прац М. Фуко (аб вызначэнні парадку дыскурсу), П. Серыё, М. Пешо, П. Анры (у ракурсе міждысцыплінарнага падыходу), В. Цюпы (літаратуразнаўчы падыход). Саіскальнік выкарыстоўвае наступнае азначэнне эстэтычнага дыскурсу – «форма камунікацыі, узаемасувязь паміж аб'ектам, суб'ектам і адрасатам, у працэсе якой ажыццяўляецца станаўленне і сцвярджэнне (інстытуцыяналізацыя) эстэтычных паняццяў, ідэй і ўяўленняў» (с.9). У дысертацыі аналізуюцца

ідэйна-эстэтычныя асновы нашаніўскай крытыкі ў працах В. Ластоўскага, С. Палуяна, М. Багдановіча, літаратурная крытыка А. Луцкевіча ў святле дыскурснага аналізу, аксіялагічныя і метадалагічныя аспекты, камунікатыўныя стратэгіі крытыкі часопіса «Полымя», ідэйныя і эстэтычныя каштоўнасці маладнякоўскай крытыкі, эстэтычная парадыгма літаратурнай крытыкі «Узвышша». Значная ўвага надаецца ўвядзенню ў шырокі навуковы ўжытак звестак аб творчасці як вядучых, так і малавядовых крытыкаў. Асобныя раздзелы і падраздзелы прысвечаны персаналіям (1.3; 2.1.2; 3.2). У дысертацыі ўпершыню грунтоўна і ўсебакова абгрунтавана адметнасць пісьменніцкай крытыкі Я. Коласа як альтэрнатывы прафесійнай крытыцы, паказаны ўплыў ідэй украінскага даследчыка А. Бялецкага на крытычную практыку А. Бабарэкі, Ю. Бярозкі.

**Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**.

Асноўныя вынікі, вывады і рэкамендацыі, сфармуляваныя ў дысертацыі А. А. Карп, грунтуюцца на навуковых палажэннях, выкладзеных у працах айчынных навукоўцаў – Т. Вабішчэвіч, У. Конана, К. Мароз, М. Мушынскага, а таксама прадстаўнікоў рускага літаратуразнаўства – Г. Белай, С. Шашукова, У. Перхіна, Я. Дабрэнкі, Г. Ціханава і інш. Манаграфія «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20–30-я гады)» (1975) М. Мушынскага – найбольш поўнае і сістэмнае даследаванне па вызначанай тэме, і аўтар дысертацыі ў значнай ступені абапіралася на яе палажэнні. У сваёй працы М. І. Мушынскі фактычна ўпершыню шырока даследаваў развіццё беларускай крытыкі і літаратуразнаўства ў 1920–1930-я гг.; выявіў яго сацыяльную датэрмінаванасць, спецыфічныя асаблівасці, унутраную логіку развіцця, раскрыў барацьбу розных метадалагічных канцэпцый, школ. Важна тое, што саіскальнікам на глебе сістэматызацыі, абагульнення і дапаўнення існуючых ведаў абгрунтаваны ўласны комплексны падыход да аналізу літаратурнай крытыкі першай трэці XX ст., заснаваны на даследаванні ўвасобленага ў ёй эстэтычнага дыскурсу.

Даследаванне, праведзенае А.А. Карп, вызначаецца канцэптуальнай завершанасцю і грунтоўнасцю. У дысертацыі праведзена значная праца па аналізу і абагульненню прац, прысвечаных літаратурнай крытыцы, багатага факталагічнага матэрыялу. Іх ацэнка вызначаецца разнастайнасцю і цэласнасцю падыходаў – з указаннем прычын, уплыву, розных бакоў узаемадзеяння.

У сваёй навуковай працы А.А. Карп прасачыла фарміраванне эстэтычнага дыскурсу ў літаратурнай крытыцы нашаніўскага перыяду і акрэсліла значэнне яе набыткаў; раскрыла ролю эстэтычнага дыскурсу ў літаратурнай крытыцы 1920-х гг., прадставіла яе ідэі, метады, каштоўнасную парадыгму, сувязь з нашаніўскай традыцыяй; вызначыла спецыфіку функцыянавання эстэтычнага дыскурсу ў літаратурнай крытыцы 1930-х гг.; вылучыла асаблівасці рэалізацыі крытыкі першай трэці XX ст. як камунікатыўнага акта.

Высновы, да якіх прыйшла А. А. Карп на аснове выкарыстання метадаў дыскурс-аналізу, культурна-гістарычнага і метаду цэласнага інтэграцыйнага аналізу, з'яўляюцца цалкам пераканаўчымі і верагоднымі.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі, з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Навуковая значнасць працы заключаецца ў тым, што А. А. Карп прааналізавала крытыку першай трэці XX ст. з улікам яе камунікатыўнай прыроды, на аснове новага для даследавання гэтай тэмы ракурсу – эстэтычнага дыскурсу. Дзеля паўнаты даследавання ў працы характарызуецца творчасць не толькі вядучых, але і малавядомых дасюль крытыкаў, удакладняюцца ўяўленні пра спадчыну вядомых крытыкаў. Асобны раздзел прысвечаны А. Луцкевічу, чыё імя доўгі час не ўводзілася ў шырокі навуковы ўжытак.

У дысертацыі акрэслены пазалітаратурны кантэкст, рэдакцыйная палітыка, маладаследаваныя пытанні станаўлення прафесійнай этыкі, функцыянавання літаратурнага рынку, стварэння рэпутацый і фарміравання нацыяльнага канона.

Практычная значнасць даследавання заключаецца ў тым, што яе вынікі дапаўняюць уяўленне пра развіццё крытыкі першай трэці XX ст., а разам з тым і пра стан тагачаснай літаратуры, развіццё літаратурнага працэсу. Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны для распрацоўкі эстэтычнага дыскурсу наступных перыядаў развіцця літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI ст. Матэрыялы даследавання будуць карыснымі пры распрацоўцы курсаў па тэорыі і гісторыі беларускай літаратурнай крытыкі, спецкурсаў, пры напісанні курсавых і дыпломных прац, пры падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.**

Змест працы, яе канцэпцыя і асноўныя палажэнні лагічна і абгрунтавана перададзены ў аўтарэфераце, а таксама ў 12 навуковых публікацыях, сярод якіх 4 артыкулы ў навуковых часопісах, уключаных у Пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь (1,96 аўт. арк.), 7 артыкулаў у зборніках матэрыялаў канферэнцый (2,17 аўт. арк.), 1 тэзісы дакладаў (0,17 аўт. арк.). Агульны аб'ём навуковых публікацый складае 4,3 аўт. арк. Вынікі дысертацыі таксама прадстаўлены ў 2-х публікацыях у перыядычным друку (0,7 аўт. арк.).

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

Афармленне дысертацыі ў цэлым, асобных яе частак і аўтарэферата адпавядае патрабаванням Інструкцыі па афармленню дысертацыі і аўтарэферата.

**Заўвагі.**

1. У аўтарэфераце і тэксце дысертацыі сярод аналізуемых прац М. Мушынскага акцэнт зроблены на выданні «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства» (20–30-я гады) (1975), якое несумненна з'яўляецца фундаментальнай працай па вызначанай тэме. А. А. Карп, вызначаючы актуальнасць тэмы свайго даследавання, сцвярджае, што вывучэнне тэмы,

распачатае М. Мушынскім ў 1970-я гг. «неўзабаве прыпынілася і «крытыка адпаведнага перыяду практычна не трапляла ў поле зроку літаратуразнаўства» (с. 5 дысертацыі), з чым і звязана неабходнасць звароту да тэмы. Разам з тым у 1988 г. М. І. Мушынскім падрыхтавана і выдадзена праца «Каардынаты пошуку: Беларуская крытыка: набыткі, перспектывы», у якой разглядаецца месца і роля крытыкі як спецыфічнай формы творчасці ў літаратурным працэсе, уплыў крытычнага слова на жывую мастацкую практыку, увага яе прадстаўнікоў да ідэйна-эстэтычнага ўзроўню літаратуры, пададзены партрэты пачынальнікаў беларускай крытыкі.

Не згадваецца ў дысертацыі і раздзел «Крытыка і літаратуразнаўства» акадэмічнага выдання «Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.», якое ўяўляе сабой фундаментальнае даследаванне літаратурнага працэсу Беларусі, дзе ў аглядных артыкулах і характарыстыках творчых індывідуальнасцяў буйных пісьменнікаў раскрываюцца нацыянальная спецыфіка беларускай літаратуры, яе роля і значэнне ў паглыбленні грамадскай свядомасці, выхаванні патрыятызму і гуманізму, паказаны патэнцыял беларускай духоўнай культуры ў галіне мастацкага слова на працягу XX стагоддзя, яе ідэйна-эстэтычнае багацце і непаўторнасць. Дзякуючы гэтаму выданню вернуты ў сферу навуковага асэнсавання многія творы нацыянальнай літаратуры, а некаторыя пазбаўлены ад негатыўных ацэнак. Навуковым калектывам выдання вырашалася задача канцэнтраванага філасофска-эстэтычнага пазнання літаратурнага працэсу. У першым томе выдання праводзіцца аналіз развіцця крытыкі і літаратуразнаўства ў 1901–1920 гг. , у другім томе – у 1921–1941 гг.

2. У кола аўтараў, што трапілі ў дысертацыйнае даследаванне, уваходзяць у асноўным тыя, хто насуперак негатыўным тэндэнцыям працавалі з эстэтычнымі катэгорыямі. Саіскальнік тлумачыць гэта наступным чынам: «У прапанаванай працы разглядаюцца тыя тэксты літаратурнай крытыкі, у якіх яна сапраўды выступае правадніком эстэтычных ідэй. Вульгарна-сацыялагічная крытыка не мела ў гэтым плане дасягненняў, наадварот, уяўляла сур'ёзную перашкоду для эстэтычнага дыскурсу. Яе метады як заганныя, антынавуковыя не маюць станоўчага значэння для літаратуразнаўчай навукі» (с. 7). У той жа час розныя пазіцыі ў адносінах да літаратуры розных літаратурных аб'яднанняў і асобных крытыкаў у значнай ступені ўплывалі не толькі на станоўчае развіццё і эвалюцыю эстэтычнага дыскурсу ў творчасці пісьменнікаў і ў літаратурным працэсе, але і на ўзнікненне негатыўных тэндэнцый, што таксама магло быць прадметам асобнага аналізу.

3. Саіскальнік шырока выкарыстоўвае тэрміналагічны апарат, што мае міждысцыплінарны характар, і ўводзіць яго ў поле практычнага аналізу, звязанага з тэмай даследавання. Аднак у сувязі з неўсталяванасцю асобных паняццяў і разнастайнасцю іх трактовак, пажадана прыводзіць іх канкрэтныя азначэнні (дэфініцыі) ў працы. Сярод такіх паняццяў, што патрабуюць паяснення ў адносінах да кантэксту працы і вынікаў праведзенага аналізу –

«камунікатыўная стратэгія крытыкі», «стыль крытыкі», «каштоўнасная парадыгма крытыкі» і інш.

4. У адпаведнасці з п. 21 Інструкцыі аб парадку афармлення дысертацыі, зацверджанай пастановай ВАК Рэспублікі Беларусь ад 28.02.2014 № 3 (у рэдакцыі пастановы ВАК Рэспублікі Беларусь ад 22.08.2022 № 5) (далей – Інструкцыя) аб'ём кандыдацкіх дысертацый не павінен перавышаць 100 старонак тэксту. Аб'ём дысертацыі А. А. Карп складае 126 старонак (без спісу літаратуры). З улікам таго, што Інструкцыяй дапускаецца павелічэнне аб'ёму дысертацый па гуманітарных навуках на 15 працэнтаў, колькасць старонак дысертацыі А.А. Карп перавышае рэкамендаваную на 11 старонак. Выказаныя заўвагі не змяншаюць навуковай значнасці дысертацыйнай працы А.А. Карп.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**.

Навуковы характар дысертацыі, метады і прыёмы аналізу фактычнага матэрыялу, назіранні і вывады, якія лагічна падаюцца ў працэсе аналізу эстэтычнага дыскурсу, увасобленага ў літаратурна-крытычных працах 1900–1930-х гг., – усе гэта дазваляе сцвярджаць, што А. А. Карп адпавядае навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Заключэнне**.

Такім чынам, дысертацыя Карп Алены Аляксандраўны «Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс», падрыхтаваная пад навуковым кіраўніцтвам доктара філалагічных навук Тычыны Міхася Аляксандравіча, з'яўляецца кваліфікаваным навуковым даследаваннем і цалкам адпавядае патрабаванням «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» і профілю Савета па абароне дысертацый Д 01.42.04 пры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія, а яе аўтар варты прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук ЗА:

– распрацоўку паняцця «эстэтычны дыскурс» на аснове даследавання беларускай літаратурнай крытыкі першай трэці XX ст. як камунікатыўнай з'явы;

– прымяненне комплекснага падыходу пры правядзенні аналізу фарміравання літаратурнай крытыкі першай паловы XX ст. у аспекце эстэтычнага дыскурсу на працягу трох узаемазвязаных перыядаў (нашаніўскага, 1920-х і 1930-х гг.) і вызначэнне яе набыткаў у далейшым развіцці крытычнай думкі Беларусі;

– раскрыццё разнавектарных аспектаў і з'яў, маладаследаваных у сучасным літаратуразнаўстве, якія маюць важнае значэнне для асэнсавання беларускай крытыкі на розных этапах яе станаўлення і развіцця, такіх як фарміраванне прафесійнай этыкі, функцыянаванне літаратурнага рынку, стварэнне рэпутацый, выпрацоўка нацыянальнага літаратурнага канона;

– абгрунтаванне адметнасці пісьменніцкай крытыкі Я. Коласа як альтэрнатывы прафесійнай крытыцы і вызначэнне яе ролі ў літаратурным працэсе 1930-х гг.

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў» І.Б.Лапцёнак

17.03.2023

Водгук паступіў у савет па абароне дысертацый Д 01.42.04 22.03.2023 г.
Вучоны сакратар савета (Бораў А.І.)

З водгукам азнаёмлена А. Карп (Карп А. А.)
22.03.2023 г.

Отдел правовой и кадровой

Подлинность подписи удостоверяю
Ведущий юрисконсульт отдела правовой и кадровой работы Ю.А.Рыбакова
14.03.2023